Багаты на юбілеі лістапад адзначаны ў праграме мерапрыемстваў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Там з 2 па 30 лістапада ў зале беларускай літаратуры праходзіць юбілейная **кніжная выстаўка «Драматург складанай камедыйнай думкі»**, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння Андрэя Макаёнка. Тут можна пазнаёміцца з кнігамі і перакладамі пісьменніка, сцэнарыямі кінафільмаў і тэатральных пастановак. Раздзел «Яркая і непаўторная асоба» знаёміць з публікацыямі, змешчанымі ў энцыклапедычных выданнях і кнігах, што расказваюць пра жыццё і творчасць славутага камедыёграфа.

Там жа 4 лістапада да канца месяца праходзіць **юбілейная выстаўка «Па жыцці з родным словам»**, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння вядомага вучонага-мовазнаўца Міхаіла Судніка (1910–1995), чые навуковыя інтарэсы найперш былі звязаныя з беларускай лексікалогіяй і лексікаграфіяй. Значную частку экспазіцыі складаюць лексікаграфічныя працы, у стварэнні якіх вучоны браў удзел як аўтар-укладальнік, сааўтар, рэдактар, арганізатар распрацовак (сярод іх «Арфаграфічны слоўнік» (1948), «Русско-белорусский словарь» (1953), «Беларуска-рускі слоўнік» (1962), «Слоўнік асабовых уласных імён» (1965; 2005, 2-е выд.), «Русско-белорусский словарь общественно-политической терминологии» (1970), «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (т. 1–5, 1977–1984) і інш.). Таксама можна пазнаёміцца з пра-

цамі навукоўцы, прысвечанымі гісторыі станаўлення і развіцця беларускага мовазнаўства.

З 4 лістапада праходзіць **кніжная выстаўка «Мелодыі душы»**, прысвечаная 70-годдзю паэта, празаіка і перакладчыка Васіля Жуковіча. Яго пяру належаць лірычныя, публіцыстычныя і жартоўныя вершы, апавяданні, п'есы, казкі, загадкі, байкі і прытчы, эпіграмы і эпітафіі. У сваіх кнігах аўтар уздымае маральна-этычныя праблемы сучаснасці, раскрывае тэмы патрыятызму, хараства роднай прыроды, кахання, вясковага маленства і юнацтва. У раздзеле «Глыбіня паэтычнага радка» прадстаўленыя зборнікі твораў аўтара («Паклон», «Мелодыя святла», «Цана ці-шыні», «Твая місія», «У храме хараства і смутку», «Не завіце Радзіму малой» ды інш., аповесць «Як адна вясна»). Раздзел «Чароўная прыгажосць і мелодыка слова» знаёміць з творамі, пакладзенымі на музыку А. Атрашкевіч, З. Яўтуховічам, У. Буднікам, Л. Захлеўным, Э. Зарыцкім, У. Сарокіным і інш.